Голас Радзімы

№ 13 (1739)
1 красавіка 1982 г.

ГАЗЕТА БЕЛАРУСКАГА ТАВАРЫСТВА ПА КУЛЬТУРНЫХ СУВЯЗЯХ З СУАЙЧЫННІКАМІ ЗА РУБЯЖОМ
(БЕЛАРУСКАЕ ТАВАРЫСТВА «РАДЗІМА»)

Выдаецца з 1955 г.
Цана 4 кап.



З ЛЮБОЎЮ ДА ПРЫРОДЫ
(«Дзень у лесе»)
стар. 2, 3

НОВАЯ З'ЯВА Ў ЖЫЦЦІ НАШАГА ГРАМАДСТВА
(«Сельскія культурныя комплексы»)
Стар. 4

ПРА КРЭЎНУЮ ПРОДКАЎШЧЫНУ ПЕСНЯРА
(«Мікалаеўшчына»)
стар. 6

Тысячы ампул сульфацыла натрыя, якім лечаць хваробы вачэй, праходзяць праз рукі Ларысы РАСОЛЬКА. Яна працуе на Мінскім вытворчым аб'яднанні медыцынскіх прэпаратаў. [Фотарэпартаж аб гэтым аб'яднанні змешчаны на 3-й стар.]

падзеі • людзі • факты

Л. І. БРЭЖНЕЎ ВА УЗБЕКІСТАНЕ

У час наведання Ташкенцкага трактарнага завода імя 50-годдзя СССР.

З 22 па 25 сакавіка 1982 года ў Ташкенце знаходзіўся Генеральны сакратар ЦК КПСС, Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР Л. І. Брэжнеў. Ён прымаў удзел ва ўрачыстасцях, прысвечаных уручэнню Узбекскай Савецкай Сацыялістычнай Рэспубліцы ордэна Леніна, якім яна ўзнагароджана за працоўныя поспехі, дасягнутыя працоўнымі рэспублікі па развіццю баваўнаводства і вытворчасці іншых сельскагаспадарчых культур.

24 сакавіка ў ташкенцкім Палацы дружбы народаў адбылося ўрачыстае пасяджэнне, прысвечанае ўручэнню рэспубліцы ордэна Леніна. На ім з прамовай выступіў Генеральны сакратар ЦК КПСС, Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР Л. І. Брэжнеў. Прамоўца адзначыў, што ў год слаўнага юбілею нашай шматнацыянальнай Айчыны адным з важнейшых вынікаў шасцідзесяцігадовага шляху Саюза ССР, адной з галоўных крыніц нашай сілы з'яўляецца трывалая, непарушная дружба ўсіх народаў нашай краіны.

Іменна таму, што Савецкі Узбекістан увесь час ішоў плячо у плячо, у непарыўным страі з усімі брацкімі народамі СССР, ён змог так хутка падняцца з былой адсталасці і пераўтварыцца ва ўсебакова развітую, працвітаючую рэспубліку, адну з самых перадавых дзяржаў Усходу.

У сузор'і сталіц саюзных рэспублік як рукатворны сімвал брацтва і дружбы народаў СССР гарыць зорка Усходу—адроджаны з руін Ташкент. Нямала слаўных старонак у многавяковай гісторыі ўзбекскага народа. Але не ў мінулым залатая пара яго развіцця, а ў цяперашнім і будучым.

Жыццё наглядна паказвае, што насуперак паклёпу нашых ворагаў сацыялізм не толькі не вядзе да страты народамі свайго непаўторнага аблічча, асаблівасцей культуры, традыцый, а ўзнімае гэту своеасаблівасць на новую вышыню і робіць яе здабыткам многіх іншых народаў.

Л. І. Брэжнеў пацвердзіў знешнепалітычны курс СССР на трывалы мір, спыніўся на адносінах СССР з Індыяй, Японіяй і Кітаем. Адзначыў, што наша палітыка на азіяцкім кантыненце, як і на ўсіх іншых, ёсць палітыка ўмацавання міру і цвёрдага адпору ворагам міру, палітыка мірнага супрацоўніцтва з усімі, хто гэтага хоча, палітыка брацкай дружбы з краінамі сацыялізму, салідарнасці з усімі сіламі сацыяльнага прагрэсу, абароны суверэнных правоў народаў. З гэтай непахіснай ленінскай асновы нашай знешняй палітыкі мы не сыдзем ніколі.

На з'ездзе з прамовай выступіў кандыдат у члены Палітбюро ЦК КПСС, першы сакратар ЦК КПБ Ц. Кісялёў.

Прамоўца адзначыў, што наша моладзь мае ўсё для таго, каб быць на перадавых пазіцыях барацьбы за ўдасканаленне тэхнікі і тэхналогіі, арганізацыі працы і вытворчасці. Юнакі і дзяўчаты ўступаюць сёння ў працоўнае жыццё з вялікім багажом усебаковых ведаў. Мяркуйце самі. Амаль 90 працэнтаў працуючай моладзі рэспублікі ва ўзросце да 30 гадоў маюць вышэйшую, незакончаную вышэйшую, сярэднюю спецыяльную ці агульную сярэднюю адукацыю. Заўважу, дарэчы, што ў гады першай пяцігодкі сярэдні ўзровень адукацыі рабочых складаў усяго 2,5 класы пачатковай школы...

З'езд заслухаў і абмеркаваў справаздачны даклад першага сакратара ЦК ЛКСМБ У. Шаплыкі. Сярод важнейшых задач, якія сёння камсамол вырашае ў рэспубліцы,— гаворыцца ў дакладзе,— будаўніцтва гандаль, бытавое абслугоўванне насельніцтва, транспарт, развіццё сельскай гаспадаркі, у якой занята звыш 140 тысяч юнакоў і дзяўчат.

З'езд выбраў кіруючыя органы камсамола рэспублікі. Першым сакратаром ЦК ЛКСМБ названы У. Шаплыка.

УЗНАГАРОДЫ

ОРДЭН КАСТРЫЧНІЦКАЙ РЭВАЛЮЦЫІ — Ц. Я. КІСЯЛЁВУ

За вялікую арганізатарскую і палітычную работу па мабілізацыі камуністаў, усіх працоўных рэспублікі на забеспячэнне ў складаных умовах надвор'я 1981 года ўраджаю сельскагаспадарчых культур, выканання планаў і сацыялістычных абавязацельстваў па продажу дзяржаве збожжа, бульбы, іншых прадуктаў земляробства кандыдат у члены Палітбюро ЦК КПСС, першы сакратар ЦК Кампартыі Беларусі Кісялёў Ціхан Якаўлевіч узнагароджаны ордэнам Кастрычніцкай Рэвалюцыі.

З'ЕЗД КАМСАМОЛА БЕЛАРУСІ

З 25 па 26 сакавіка 1982 года ў Мінску ў Доме афіцэраў працаваў XXVII з'езд Ленінскага Камуністычнага Саюза Моладзі Беларусі, які аб'ядноўвае амаль паўтара мільёна юнакоў і дзяўчат.

РЭСПУБЛІКА НА МІЖНАРОДНАЙ АРЭНЕ

ПАСЯДЖЭННЕ КАМІСІІ

У Мінску 23 сакавіка адбылося пасяджэнне Камісіі Беларускай ССР па справах ЮНЕСКА. Са справаздачай аб дзейнасці камісіі за прайшоўшы перыяд і задачах на 1982 год выступіў яе старшыня—намеснік міністра замежных спраў БССР Л. Максімаў. Заслуханы інфармацыі аб удзеле дэлегацый БССР: у Міжнародным кангрэсе аб ролі навукова-тэхнічнай адукацыі ў нацыянальным развіцці, у 7-й сесіі Міжнароднага каардынацыйнага савета праграмы «Чалавек і біясфера», у чарговай Міжнароднай канферэнцыі па адукацыі, у нарадзе экспертаў па стварэнню банка даных па культуры, у міжнародным сімпозіуме «Мы—члены чалавечага грамадства».

Разгледжан план работы камісіі на 1982 год.

З ВІЗІТАМ У БЕЛАРУСЬ

ПРАФСАЮЗНЫЯ ДЭЛЕГАЦЫІ Ў МІНСКУ

У Мінску пабывалі дэлегацыі прафцэнтраў Аргенціны, Балівіі, Гандураса, Дамініканскай Рэспублікі, Коста-Рыкі, Парагвая, Перу, Сальвадора і Эквадора, якія былі запрошаны на XVII з'езд прафсаюзаў СССР. Госці былі прыняты ў Вярхоўным Савеце Беларускай ССР. Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР Л. Чагіна інфармавала іх аб дзейнасці Вярхоўнага Савета, расказала аб тым, як у рэспубліцы ажыццяўляюцца ленінскія прынцыпы дэмакратыі.

Адбылася сустрэча ў Беларускім рэспубліканскім савеце прафсаюзаў. Старшыня Белсаўпрофа М. Полазаў пазнаёміў гасцей са структурай беларускіх прафсаюзаў, іх шматграннымі функцыямі і правамі, адзначыў вялікую ролю, якую яны адыгрываюць у вырашэнні задач, пастаўленых перад савецкім народам XXVI з'ездам КПСС.

Госці пабывалі на прадпрыемствах, зрабілі паездку па гораду, агледзелі яго культурныя і гістарычныя помнікі, наведалі Дом-музей I з'езда РСДРП і ВДНГ БССР.

СЕЛЬСКІЯ НАВІНЫ

СЯЎБА НА ПАЛЕССІ

Сёлета земляробы Палесся раней звычайнага прыступілі да сяўбы яравых на асушаных тарфяніках. Сонца і вецер хутка падсушваюць зямлю, таму прымаюцца меры, каб забяспечыць захаванне вільгаці ў глебе. Ранні тэрмін сяўбы на тарфяніках, пакуль яны адтаялі на невялікую глыбіню, выгадны і тым, што «чарапок»—так завуць мёрзлы пласт глебы—добра трымае машыны. Гаспадаркам Брэсцкай вобласці трэба пасеяць сёлета каля двухсот тысяч гектараў яравых збожжавых. Асноўную плошчу зойме найбольш высокаўраджайная ў мясцовых умовах культура—ячмень.

СТВАРАЕЦЦА САЎГАС

Некалькі гадоў назад землеўпарадчыкі абследавалі вялікае забалочанае ўрочышча Трэмля ў Петрыкаўскім раёне і ўстанавілі, што яго землі прыгодныя для асваення. Было прынята рашэнне стварыць новы саўгас мяса-малочнага напрамку. Тут на 4 875 гектарах будуць праведзены меліярацыйныя работы, заложаны дрэнаж. Сёлета на будаўніцтве новага саўгаса будзе асвоена 800 тысяч рублёў.

У будучым саўгасе пачата будаўніцтва сталовай, інтэрната, вядзецца пракладка падземных камунікацый.

ГАСПАДАР ЦІХАГА АБХОДУ

ДЗЕНЬ У ЛЕСЕ

ГАДОЎ МО СЕМ не бачыўся я з Чэркасам. Бадай, з таго памятнага дня, калі хадзілі на ваўкоў... Тадзіславу Вікенцьевічу ў той раз пашанцавала — забіў ажно двух драпежнікаў... Як мы зайздросцілі яму! А ён, крыху збянтэжаны і ўсхваляваны, толькі пакручваў свае пасівелыя вусы і ўсміхаўся: маўляў, бывала і не такое. І расказаў нам, як аднойчы на яго напаў падстрэлены дзік. А здарылася гэта ў час санітарнай высечкі лесу. Якраз пад вечар пачуў недзе выстрал. Спачатку не надаў значэння. Сезон паляўнічы, ці мала хто мог стрэліць. І ўсё ж нешта прымусіла насцярожыцца. Выйшаў на дарогу, абмінуў лужок, а там да аблогі... І раптам недзе з боку пачуў трэск ламачча... Прама на яго ляцеў дзік гэтак пудоў на шэсць. Хавацца было позна. І тут Чэркас не разгубіўся — выхапіў нож... Сілай удара кабан збіў яго з ног, але і сам зваліўся...

Я часта ўспамінаў гэты выпадак... Выразна ўяўляў сцэну сутычкі з раз'юшанай жывёлінай і думаў: на такі ўчынак быў здольны чалавек сілы выключнай, з халоднай галавой...

АЛЕ Ж ДЗЕ дом Чэркасаў? Было ўжо недзе гадзін каля сямі раніцы, і я баяўся, што не застану Тадзіслава Вікенцьевіча. Пара стаяла на вёсцы гарачая, сенакосная. Чуваць было, як у дварах кляпалі косы, а ля калодзежаў рухавыя жанчыны запасаліся на дзень вадой. У паветры ж пахла смажанай бульбай, капустай, свежанінай...

На вуліцу выбег хлапчук гадоў васьмі. Пытаю, дзе жыве Чэркас Тадзіслаў Вікенцьевіч.

— А за той хацінай, што пафарбавана, бачыце?

Як жа я адразу не прызнаў сядзібу? Вунь і агарод знаёмы, і веснічкі тыя ж, што і сем гадоў назад... Бяруся за клямку, іду па двары.

Віляючы хвастом і фыркаючы, выбегла насустрач сучка: худая такая, вушастая. Папяўнічая. А дзе ж Буран? Няўжо загінуў?

Дзверы ў хату расчыненыя. Нікога няма? Не, бачу ля печы гаспадыню — гэткую ж ветлівую і дабрадушную, як і сам Чэркас. Яна недзе родам са Смаленшчыны, а таму часта блытае рускія словы з беларускімі... Мяне заўважае, вітаемся.

— А дзе ж Тадзіслаў Вікенцьевіч?

— А ён тут, возле двара. Сейчас пагукаю...

Яна выйшла на ганак.

— Та-адзя, во Та-адзіслаў... К тебе человек... Не знаю. Ідзі.

Рыпнулі дзверы, зачыніла іх.

— Мухі надакучаюць, толькі што паганяла, зноў лезуць... А кабі на іх бес...

У сенцах нешта забрынчэла. Чую голас Чэркаса...

Цікава, ці пазнае мяне? Столькі ж часу...

Пазнаў.

— А як жа, на ваўкоў хадзілі... Мы тады іх... Ажно пяць уклалі. Ды ты сядай...

І да жонкі:

— Анастасся, накрывай стол. Давай бульбу, дранікі, смятану... А малако як? — І гладыш з малаком стаў. Снедаць будзем. Чалавек з дарогі. І ў мяне расіны яшчэ ў роце не было. Зранку на нагах. Каня перавязаў, бычку травы падкасіў, жэрдак начасаў... У вёсцы работ нямала, асабліва летам...

Я слухаю Чэркаса. Голас такі ж зычны, усмешка шчырая, твар загарэлы...

Любіць бліны.

— А вось малако салодкае не п'ю. Кіслае, смятану — калі ласка, а салодкае не люблю... Ды ты сілкуйся. А потым па лесе паходзім, адведаем луг, да пчол зазірнём... З пустым жыватом не дзела. Га?

Мы з апетытам паснедалі і выйшлі на двор.— Пальма мая (так звалі сучку) ажно дванаццаць нарадзіла. Схуднела як, ды адкармлю, за мной не стане.

— А дзе ж Буран? — цікаўлюся.

— Буран? Бура-а-н,— кліча зычным голасам,— ка мне!

Ля стажка сена бачу рыжаваты хвост сабакі. Буран падбег да гаспадара, лашчыцца.

— Стары, гады не тыя,— гаворыць Чэркас,— а на другога не змяняю. На паляванні возьме след і не адступіць. І Пальму грамаце сваёй вучыць... Але што гэта мы тут? Ідзём у лес.

МЫ ВЫЙШЛІ з дому недзе каля гадзін васьмі. Ішлі напрамкі. Чэркас — з касою, з торбачкаю за плячыма, а я — з сякераю ды з мянташкаю.

— За дзень, бывала, находзішся,— расказвае Тадзіслаў Вікенцьевіч,— дык ледзь да хаты прывалачэшся. Але калі быў маладзейшы, стома праходзіла хутка. Цяпер жа... Гады бяруць сваё. Да пенсіі рукой падаць... Але леснікаваць буду. Хіба мо не здолецьму, а так... Прывык да работы. Няма таго дня, каб у лес не зазірнуў. Паходзіш па барах ды па лугах — бы памаладзееш. Нічога, што пякуць пяткі — на душы лёгка. А абход у мяне ціхі. Пажары мілуюць, каб і надалей так. Самавольных парубак няма.

Тадзіслаў Вікенцьевіч глядзіць мне ў вочы, жмурыцца. Увогуле ж, у абходзе дысцыпліна. Ніводзін чалавек самавольшчыну не чыніць...

І ажыўляецца.

— Зараз у лес прыйдзем, пакажу нештачка такое — вачам не паверыш.

У лесе ціха. Дыхаецца лёгка, на ўсе грудзі.

— Вунь, выступ,— паказаў рукой,— чарнее, бачыш?

— Ага.

— Там Буран раз кабана ганяў. Мо гадзін пяць насіўся. А дзік трапіў прыткі. Буран так і не загнаў яго... Затое вярнуўся сам без ікла. Ох, і паенчыў жа. Думаў, сканае ад болю. Ды абышлося.

За размовамі зусім не прыкмецілі, як дайшлі да лесу. Трава яшчэ не абсохла, і ранішняя раса адразу ж падмачыла ногі. Чэркас ступаў шырока, азіраўся па баках, прыслухоўваўся. Спявалі птушкі, недзе непадалёку кувала зязюля, пад нагамі трэснула галінка... Тадзіслаў Вікенцьевіч, які ішоў наперадзе, раптам радасна ўскрыкнуў:

— Касавокі за паваротка...

І я ўбачыў зайца. Прытуліўшы вушы, нечым напалоханы, ён стралой ляцеў да гушчара.

— Іх тут нямала,— кажа Чэркас.— Гады тры назад падабраў у хвойнічку зусім малое і кволае зайчаня. Дай, думаю, занясу дамоў. Вычухаецца, прывыкне да нас, няхай жыве. А там будзе бачна. Так і зрабіў. Прынёс. Сыну свайму, Толіку, кажу: вось, на выхаванне... Ды глядзі, не крыўдзі малога...

І мы выхадзілі зайчаня. Ачуняла, сіл набралася, падрасло. Па хаце пачало гуляць. Забярэцца гэтак пад ложак і пачне коўдру лапкамі драпаць. Вясёлы быў зайчык. З катом любіў забаўляцца. А аднойчы яго не стала. Акно ў хаце не зачынілі, дык ён і марскануў у лес. Вельмі ж сын перажываў....

Мы прайшлі гэтак па лясных сцежках кіламетраў пяць. А потым звярнулі ў гушчар. Птушыны шчэбет здаўся ўжо не такім дружным, а недзе збоку запахла гніллю...

— Во, і балотны лунь,— падказаў Чэркас.— Бач, як крылом махнуў незадаволена. Патрывожылі яго. Мо адпачываў дзе ці здабычу драў. Птушка гэта не пераборлівая. Падавай ёй вужоў, жаб... На зайцоў палюе, нават лісяня падужаць можа.

Тым часам мы павярнулі крыху ўправа ад гушчару, і Тадзіслаў Вікенцьевіч суцішыў крок. Прыслухаўся. Падмігнуў шматзначна: маўляў, рыхтую сюрпрыз. І тут жа падняў рукі, склаў далоні трубкаю і крыкнуў:

— Губ-гы-ы, губ-гы-ы, губ-гы-ы...

Яшчэ раз. Потым зноў...

— Бач, загуляў недзе, ці што? А мо чаго забаяўся?

— Пра каго гэта? — цікаўлюся.

— Як пра каго?

І тут недзе збоку затрашчала галлё: на маленькі лясны пятачок, які акружалі старыя хвоі, амаль выкаціўся дзічок кілаграмаў так пад сто. Я схаваўся. Кабан пастаяў крыху, нюхнуў паветра і кулём да Чэркаса. А той дастаў з торбачкі кавалак хлеба, бульбу, высыпаў жмені тры гароху...

Дзічок ахвотна прыняўся за ласункі і амаль не звяртаў увагі на Тадзіслава Вікенцьевіча, які гладзіў яго за вушамі, ля жывата...

Вось дык сюрпрыз! Я глядзеў на гэту сцэнку і амаль не дыхаў. Але што далей? І тут падвяла цікаўнасць: я не вытрымаў, пакінуў схованку. Кабан жа насцярожыўся і незадаволены тым, што не паспеў даесці бульбу, павярнуў да гушчару. Чэркас замахаў рукамі, маўляў, што ж ты нарабіў, хавайся. Але было позна. Дзік крутнуў за хвоі і памінай як звалі.

Мы нейкі час маўчалі. Але па дарозе да лужка, дзе збіраліся касіць, Чэркас раптам ажывіўся.

— Хочаш знаць, як прыручыў дзіка?

І расказаў. Малога, хворага ён падабраў яго гады два назад. Паіў малаком, жалудамі карміў... Спачатку трымаў у невялікай яме, а як падрос дзічок ды прывязаўся да яго, адпусціў на волю... Вось так і пасябравалі.

Мы выйшлі да лужка і— напрамкі да вулляў.

— А цяпер пакажу пчол.

Было асабліва цікава слухаць гэтага чалавека, які здолеў пасябраваць і з дзічком, і з пчоламі...

— Яны мяне не джаляць. Магу ля іх тупаць, і нічога. А які мёд збіраю,— гаварыў зычным голасам Тадзіслаў Вікенцьевіч.— Чысцейшы, без сахарынкі. На лужку пчолам раздолле...

І зноў да мяне:

— А вунь прагалінка. Там і касіць будзем...

Апоўдні, добра натомленыя і разамлелыя на сонцы, адпачыўшы на ўскрайку лужка, рушылі дамоў. Тадзіслаў Вікенцьевіч расказваў аб сваёй рабоце, аб таварышах... Планах... А потым мы зазірнулі на дзялянку, дзе брыгада рабочых вяла прарэджванне...

Варочаліся ў Кавалічы прыцемкамі... Недзе паблізу прайшла чарада кароў.

— Малаком запахла як, — удыхнуўшы паветра на ўсе грудзі, сказаў Чэркас.— А мне заўтра ў лясгас. Я ж член партыйнага бюро...

Ля веснічак ужо стаяла Настасся Якаўлеўна. Убачыла нас і заківала галавой:

— Але ж і надумалі на цэлы дзень. Вячэра даўно стыне.

Праз мінут колькі мы сядзелі за знаёмым мне шырокім сталом, і кожны па-свойму радаваўся адыходзячаму дню.

Яраслаў СІДОРЫН.

ДОРАЦЬ РАДАСЦЬ ЖЫЦЦЯ



У 1929 годзе на ўскраіне Мінска была пабудавана першая ў Беларусі фармацэўтычная фабрыка, якая выпускала прасцейшыя медыкаменты — мятную ды валяр'янавую, ландышавую і палынную настойкі, тут фасавалі рамонку, нафталін, рэзалі марлю на бінты. Пасля вайны фабрыка была вядома як завод медпрэпаратаў. На базе цэха Мінскага мясакамбіната ў 1959 годзе быў створаны завод эндакрынных прэпаратаў, які вельмі хутка заваяваў вядомасць.

Пяць гадоў назад з гэтых двух прадпрыемстваў было створана Мінскае вытворчае аб'яднанне медыцынскіх прэпаратаў. Зараз тут выпускаецца каля 40 назваў розных лякарстваў. Гэта рэапаліглюкін з глюкозай, вітагепат, андэкалін, інсулін, гепарын, кровазамяняльнік, тэтрацыклін і многія іншыя. Тут асвойваюцца новыя прэпараты, што выпускаюцца ў СССР упершыню. Прадукцыя пастаўляецца ў многія краіны свету. Работа на гэтым прадпрыемстве наладжана ў некалькі змен, і таму для рабочых, якія працуюць у начную змену, арганізуецца бясплатнае гарачае харчаванне. Летам на возеры Нарач створаны ўмовы для адпачынку рабочых з сем'ямі. Час школьных канікул дзеці праводзяць у піянерскім лагеры «Зорка». На прадпрыемстве часта арганізуюцца выезды на лыжную базу, турыстычныя паходы, паездкі ў зоны адпачынку. Зараз будуецца свой санаторый-прафілакторый.

Работнікі Мінскага вытворчага аб'яднання медыцынскіх прэпаратаў сваёй працай дапамагаюць людзям пераадолець хваробу, дораць ім радасць жыцця.

НА ЗДЫМКАХ: тут вырабляюць эндакрынныя прэпараты; лабараторыя ЭВМ; цэх па вытворчасці інсуліна і гепарына; Марына ЦВІК упакоўвае медыкаменты; прадукцыя прадпрыемства.

Святаслаў КРЫЦКІ.
Фота аўтара.

«АСК—СЕЛЬГАС»

Праца ў сельскай гаспадарцы сёння немагчыма без складанейшай тэхнікі, выкарыстання апошніх дасягненняў хіміі, біялогіі, генетыкі. Тэмпы навукова-тэхнічнага прагрэсу на вёсцы імкліва ўзрастаюць, і неабходна ўмела кіраваць, накіроўваць пошук даследчыкаў на вырашэнне самых важных пытанняў.

— Інфармацыю, што паступае ад бухгалтара, эканаміста, агранома, мы канцэнтруем у адзіным банку памяці, каб яе можна было лёгка і хутка выкарыстаць. Збор інфармацыі толькі першы этап работы па ўкараненню ў рэспубліцы «АСК —сельгас». Канчатковая мэта— стварэнне комплексу на аснове ЭВМ, што дапамагае прыняць аптымальнае рашэнне ўсім звенням сельскагаспадарчай вытворчасці, — расказвае намеснік дырэктара беларускага праектна-тэхналагічнага інстытута аўтаматызаваных сістэм кіравання ў сельскай гаспадарцы Вадзім Сідаровіч.—Па нашых задумах, сістэма ахопіць усе ўзроўні кіраўніцтва — ад міністэрства да раёна і калгаса ці саўгаса. Цяпер ствараюцца тры падсістэмы. Адна з іх звязана з праграмай павышэння ўрадлівасці глебы, другая — вырашае комплекс задач па жывёлагадоўлі і трэцяя — дапаможа наладзіць рацыянальную вытворчасць і выкарыстанне кармоў. Усяго ў цяперашняй пяцігодцы нашы вучоныя створаць праграмы для камп'ютэраў амаль па 90 практычных задачах.

У жывёлагадоўлі — вядучай для Беларусі галіне сельскай гаспадаркі — гэта біялагічная ацэнка жывёлы і кіраванне ўзнаўленнем (ставіцца мэта штогод на трэць абнаўляць яго каштоўнымі пародамі). У кормавытворчасці электронна-вылічальныя машыны бяруць на сябе разлік сбалансаванасці і аб'ёмаў кармоў, вызначэнне структуры пасяўных плошчаў для буйных фермаў і комплексаў, падкажуць, колькі і дзе трэба будаваць кармасховішчаў. Камп'ютэры паклапоцяцца і аб раўнамерным размеркаванні паміж гаспадаркамі новай тэхнікі, аб найбольш эфектыўным складзе іх машынна-трактарнага парка і аб многім іншым.

У рэспубліканскім інфармацыйна-вылічальным цэнтры дзейнічаюць некалькі магутных ЭВМ, звязаных практычна з усімі раённымі ўпраўленнямі сельскай гаспадаркі і з дыспетчарскімі пунктамі асобных калгасаў.

— Ужо сёння яны вырашаюць 39 задач «АСК-сельгас».— сказаў дырэктар цэнтра Уладзімір Глушко. — Цяпер вучоныя склалі дэталёвыя аграхімічныя карты ўсіх палёў рэспублікі. У іх улічаны фізіка-хімічныя ўласцівасці глебы, запасы пажыўных рэчываў. ЭВМ супастаўляе даныя карт з планавымі заданнямі калгасаў і рэкамендуе аб'ектыўна неабходную колькасць мінеральных угнаенняў.

Падсістэмы АСК, рэгулюючыя племянную работу ў калгасах, пазбавілі заатэхнікаў ад працаёмкага супастаўлення некалькіх дзесяткаў даных, якія трэба ўлічваць, адбіраючы жывёл для ўзнаўлення.

Як спалучаецца «дыктат» камп'ютэра з правам калгаснікаў самім вырашаць свае гаспадарчыя справы?

— Машынная «мудрасць» — зусім не падмена гаспадарчай ініцыятывы, — лічыць начальнік упраўлення АСК Міністэрства сельскай гаспадаркі Беларусі Міхаіл Крапіўніцкі. — «АСК-сельгас» функцыяніруе як дарадчык, падказчык, своеасаблівы электронны даведнік, звярнуўшыся да якога, земляроб застрахуе сябе ад памылак.

Вячаслаў ХАДАСОЎСКІ.

Мікалай Кручкоў па прафесіі будаўнік. Ён добра ведае і любіць сваю справу. Але не менш ён любіць і маляваць. Калі выпадае часам вольны дзень ці хоць некалькі гадзін, Мікалай Фёдаравіч бярэ ў рукі пэндзаль альбо аловак і малюе партрэты, пейзажы. Яго творы можна ўбачыць у кабінетах, ленінскіх пакоях фабрык і заводаў Дзяржынскага раёна. Дарэчы, аддае ён свае карціны бясплатна. Лепшыя сярод іх—партрэт Фелікса Дзяржынскага, «Восеньскі пейзаж», партрэт жонкі Зінаіды Яніфанаўны, «Заход сонца», якія выстаўляліся на шматлікіх выстаўках.

У сваіх творах самадзейны мастак Мікалай Кручкоў апявае Радзіму, працу людзей.

НА ЗДЫМКУ: М. КРУЧКОЎ у сябе дома.

Фота І. ДАРОДНЫХ.

пішуць землякі

ПРИДВОРНЫЕ ЛАКЕИ

ЭТО ПИСЬМО ПРИСЛАЛ ИЗ НЬЮ-ЙОРКА БЫВШИЙ ЖИТЕЛЬ МИНСКА. ПЕЧАТАЕМ ЕГО БЕЗ СОКРАЩЕНИЙ И КОММЕНТАРИЕВ

Я только что развернул газету «Дейли Ньюс», и меня залила краска стыда: на второй странице, где печатается ежедневный статистический отчет о преступлениях в Нью-Йорке, помещен фотоснимок, на котором запечатлен стареющий виолончелист Мстислав Ростропович, склонивший лысую голову в раболепном поцелуе перед женой американского актера, ныне фигляра от политики Рональда Рейгана. Стыдобушка-то какая!

За спиной придворного лакея, оставившего почет и славу, поистине народное уважение в СССР, не видно музыкантов Вашингтонского национального симфонического оркестра. Но если обратиться к каждому из них с вопросом, заданным мной одному из нью-йоркцев в Карнеги-Холл: как вы оцениваете мастерство дирижера, то наверняка услышал бы похожее на ответ простого американца: «Мстислав Ростропович очень скучный дирижер, и терпим его постольку, поскольку он наш хозяин».

Прекрасный в прошлом музыкант М. Ростропович «заработал» известность на пресмыкании перед врагами советского народа. Как музыкант, он потерял свое лицо, как человек, лишился уважения. Конечно, он получает от своих политических хозяев колоссальные «мани» (деньги), позволяющие скупать земли под Нью-Йорком, надеется на присвоение титула «сэр» от английской королевы. Но что получили от своих хозяев более мелкие артисты, хлынувшие на щедрые посулы крикунов из США и Израиля?

Не секрет, что несколько лет назад из СССР выехали под различными предлогами музыканты. Многие из них изменили курс: чтобы не стать пушечным мясом в Израиле, обосновались в США. Как сложились их судьбы?

Как-то под дверь мне бросили листок, который оказался афишей на концерт Аиды Ведищевой. Выступать Ведищева должна была в сараеобразном Бронкс-Хаузе, центре сбора грязной информации о Советском Союзе. Здесь звучат лживые измышления о русском народе. На концерт «звезды» я не пошел, и не только потому, что предстоял концерт «Нью-Йорк сити балет» в Линкольн-Центре, но и оттого, что терпеть не могу тех, кто ныне пресмыкается перед американскими деятелями, кто еще недавно собирал огромную публику в Москве, Киеве, Минске, выступая в лучших залах великой страны.

Кстати, как сообщил потом знакомый, выступление Ведищевой собрало в зале 150—170 человек. Среди них было два американца, а остальные те, кто поехал в США «объединиться» с родственниками. Слушали, слушали эти американцы всхлипывания певицы, да и возмутились: как она смеет выступать с непонятными песнями перед представителями арийской нации, как она смеет посягать на наши доллары? И потребовали американцы возврата денег. Шум, толкотня, смех: в «творческую» биографию бывшей советской певицы, ныне подвизающейся в ресторанах Бруклина и Бронкса, вписана еще одна «заметная» страница...

Да, среди тех, кто оставил ради сионистской болтовни величайшую в мире страну, Советский Союз, не многие могут целовать ручку Нэнси Рейган, бывшей плохонькой актрисы, ныне жены президента. Большинству досталась постыдная участь изгоев. Вот еще один пример того, как низко падает актер, изменивший Родине.

Случилось мне быть в одной антисоветской организации Нью-Йорка. Попросил меня бывший житель Слуцка, а ныне безработный и безъязычный горемыка Аркадий Н. выхлопотать пособие на жизнь. Пришел я в ту организацию, которая дает в печать сведения о «нарушениях» прав советских евреев. В огромной комнате ожидают вызова к хозяевам новые «господа»—бывшие советские врачи, инженеры, учителя всех рангов (от простых до профессорских) и все трясутся, что будет: устроят ли на работу, дадут ли помощь на квартиру и т. д.? Присмотрелся я к одному посетителю, и словно током ударило меня: так это же Крамаров!

Вокруг зашушукались: «Крамаров, звезда советского экрана». «Звезда» сидела скромно, ни на кого не глядя. Да и кому и на кого было взирать? Остались в прошлом сияющие залы Кремлевского Дворца съездов, где проходили, проходят и будут проходить Международные кинофестивали, минского Дворца спорта и так далее. Ныне окружает грязная, преступная, страшная, как кошмар, жизнь в США: нет ни работы, ни денег, ни языка.

И сидит Крамаров в опустошенном состоянии. Из комнаты хозяев выкликнули: «Господин Крамаров!» И «господин» встал, пошатнулся, скривился в болезненной улыбке. К двери шел, покачиваясь то ли от физического бессилия, то ли от сознания тягостной и постыдной беседы с «хозяином». Таков бывший актер, чье искусство теперь никому не нужно в Америке.

Мой знакомый спросил меня на ухо: «Это был тот самый Крамаров?» Я ответил: «Да». «А какой бедненький! Смотри, куртка оборвана, джинсы грязные, а туфли-то, туфли...» — комментировал мой собеседник.

Да, на встречу с вершителем его судьбы шел тот, кто представляет бывших советских евреев, поддавшихся на сладостный зов международного сионизма и получивших в США звонкую пощечину и окрик: «А мы вас не звали!».

Знает ли тот же М. Ростропович о судьбах бывших советских музыкантов в США и в других странах? Нет, своя рубашка ближе к телу, оттого и склоняется в таком почтительном поцелуе перед Нэнси Рейган коленопреклоненный раб.

Владимир ЕФРЕМОВ.
Нью-Йорк.

Што? * Як? * Чаму?

«У вёсцы Жыровічы Слонімскага раёна створаны сацыяльна-культурны комплекс. Вакол яго аб'яднаны ўстановы культуры, сярэдняя школа, музей атэізму, музычная школа, дом быту, бальніца.

Грамадскі савет пры Доме культуры праводзіць цыкл мерапрыемстваў па працоўнаму, маральнаму і атэістычнаму выхаванню. Пры сельскім кафэ пачаў працаваць клуб маладой гаспадыні, пры бальніцы дзейнічае клуб для бацькоў».

(З газетнай інфармацыі)

СЕЛЬСКІЯ КУЛЬТУРНЫЯ КОМПЛЕКСЫ

Яшчэ гадоў дзесяць назад таго, пра што пойдзе гаворка, не існавала. Гэта зусім новая з'ява ў жыцці нашага грамадства, народжаная пэўнымі зменамі ў сацыяльна-культурным становішчы сучаснай вёскі. Спачатку новая справа прайшла як бы стадыю праверкі, эксперыменту ў некалькіх раёнах, абласцях. Цяпер яна ўкараняецца па ўсёй краіне. Знешнія праявы гэтага руху не надта бачны. Іх нельга атаясамліваць з будаўніцтвам, скажам, шыкоўнага Палаца культуры ці рэстарана ў калгасе. Хаця і гэта можа быць звяном агульнага ланцужка. Узнікненне культурных комплексаў — справа больш складаная, глыбінная. Каб лепш зразумець яе сутнасць, вернемся да вытокаў, да першых гадоў Савецкай улады.

Наша дзяржава заўсёды клапацілася пра духоўнае развіццё кожнага члена грамадства, пра далучэнне шматмільённых народных мас да вяршынь сусветнай культуры. Ліквідацыя непісьменнасці, стварэнне разгалінаванай сеткі хат-чытальняў, а потым бібліятэк, паўсюднае развіццё мастацкай самадзейнасці працоўных— рашаючыя крокі на гэтым шляху. З якім энтузіязмам збіраліся вяскоўцы ў якой-небудзь цьмяна асветленай пуні, каб паглядзець прадстаўленне мясцовага драмгуртка! Якім незабыўным святам станавілася для калгаснага хору выступленне ў Маскве! А колькі бліскучых талентаў з самых аддаленых куткоў краіны вынесла гэтая магутная хваля культурнага ўздыму! Адны сталі зоркамі прафесійнай сцэны, славутымі літаратарамі, мастакамі. Іншыя прысвяцілі жыццё асветніцкай рабоце, выхаванню падрастаючага пакалення.

Ішоў час і нёс з сабой змены. Можа быць, не такія бурныя, але не менш грунтоўныя. У краіне была ўведзена ўсеагульная сямігадовая адукацыя, потым — сярэдняя. У кожную вясковую хату прыйшло радыё, цяпер дык і тэлевізар. Калгасы і саўгасы сталі будаваць на сваіх цэнтральных сядзібах такія Палацы культуры, што сталічныя артысты з прыемнасцю прымаюць запрашэнне выступіць на іх сцэне. А дзякуючы сучаснаму транспарту вяскоўцы бываюць і на спектаклях, канцэртах, прадстаўленнях непасрэдна ў тэатрах, філармоніях, цырку...

І вось такая, здавалася б, ідэальная сітуацыя — вясковец і гараджанін у адзін і той жа дзень знаёмяцца з тэлепрэм'ерай, навінамі літаратуры і кіно — выбухнула мноствам праблем. Савецкага чалавека, як асобу актыўную, дзейную, не задавальняла роля спажыўца ў галіне культуры. Прага творчасці, нейкага саўдзельніцтва ў стварэнні духоўных каштоўнасцей грамадства штурхала людзей на пошукі новых шляхоў. Мастацкая самадзейнасць набыла нібы другое дыханне. Колішні энтузіязм падмацаваўся прафесійным кіраўніцтвам, і год ад году патрабуецца ўсё больш спецыялістаў — рэжысёраў, дырыжораў, балетмайстраў — для работы з артыстамі-аматарамі. Значыць, гараджанін мае магчымасць выбіраць сабе ў вольны час занятак па душы. А што ж вясковец? Балетмайстра ж не запросіш нават у сяло на 100 двароў. Вось тут і сталі ўзнікаць вясковыя культурныя комплексы.

У межах аднаго калгаса ці сельсавета пад кіраўніцтвам грамадскага савета аб'ядноўваюць свае намаганні работнікі Палаца культуры і клубаў, бібліятэк, мясцовага музея, музычнай школы... Разам атрымліваецца ладны атрад здольных, прафесійна падрыхтаваных працаўнікоў. Да іх звычайна далучаюцца і многія настаўнікі, інжынеры, аграномы, заатэхнікі, якія ў час вучобы ў інстытуце авалодалі нейкай дадатковай спецыяльнасцю. (Гэта практыкуецца паўсюдна). Такім чынам ствараецца моцнае культурна-асветнае асяроддзе, якое мае дзейсны ўплыў на навакольных людзей. І ў калгасным хоры збяруцца спевакі з некалькіх вёсак — гаспадарка выдзяляе транспарт для іх, і каб прыехалі на рэпетыцыю, і каб выступілі па чарзе ў кожнай вёсцы. А кіраваць будзе выкладчык музычнай школы. Літаратурны клуб для школьнікаў узначаліць, напрыклад, бібліятэкар, а фотагурток — інжынер... Кожны будзе рабіць тое, што лепш умее, да чаго мае здольнасці, чаму навучыўся раней. З ахвотай і цікавасцю перадаючы свае веды іншым, будзе расці і ўдасканальвацца, пастаянна шукаць нешта новае. Словам, жыць творча. А як сцвярджаюць сацыёлагі, чалавек, які актыўна праводзіць уласны вольны час, і на вытворчасці, на службе больш ініцыятыўны і дзелавы работнік.

Стварэнне культурных комплексаў — справа перспектыўная. Месцамі іх называюць сацыяльна-культурнымі, тады да вышэй пералічаных устаноў далучаюцца сельскі дом быту, бальніца, магазіны, кафэ. Іх сумесныя дзеянні спрыяюць агульнаму ўздыму культуры сяла ў самым шырокім сэнсе — культуры працы, быту, чалавечых адносін.

НА МАСКОЎСКІМ ЭКРАНЕ

Вечар «Тэлівізійныя фільмы Беларусі» адбыўся ў Маскве. У Цэнтральным Доме кіно майстры экрана рэспублікі паказалі дакументальны фільм «Сярод шумнага балю», пастаўлены па сцэнарыю Э. Міловай і Г. Удавенкава рэжысёрам С. Фрыдляндам, і мастацкую двухсерыйную карціну «Адзіны мужчына», створаную на студыі «Беларусьфільм». Сцэнарый Л. Ліхадзеева, пастаноўка В. Плоткіна.

Новыя работы, якія расказваюць аб нашых сучасніках, цёпла сустрэлі гледачы. На вечары выступілі аўтары фільмаў.

СЁЛЕТА наша краіна — Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік—адзначыць сваё 60-годдзе. Гэты юбілей—вялікае свята для ўсіх народаў нашай многанацыянальнай Радзімы. Шасцідзесяцігадовая гісторыя Савецкага Саюза з'явілася яркім прыкладам увасаблення ў жыццё небывалых раней сувязей паміж вялікімі і малымі нацыямі і народнасцямі СССР, заснаваных на роўнасці і дружбе, нарадзіўшых адзінства савецкага народа — гэтай новай гістарычнай супольнасці людзей першай у свеце сацыялістычнай дзяржавы. Іменна адзінства, дружба, брацкая ўзаемадапамога далі нам магчымасць дабіцца значных поспехаў ва ўсіх галінах жыцця, вырашыць многія сацыяльна-палітычныя праблемы. У адзінай савецкай сям'і расцвіла і наша, некалі адсталая, Беларусь. Сёння ва ўсім свеце вядома яе прамысловая і сельскагаспадарчая прадукцыя, мастацкія калектывы, яе літаратура і самабытная народная творчасць. У сувязі з 60-годдзем утварэння СССР Беларускае таварыства «Радзіма» і рэдакцыя газеты «Голас Радзімы» прапануюць замежным суайчыннікам прыняць удзел у віктарыне.

ШТО ВЫ ВЕДАЕЦЕ ПРА СССР?

1. Калі і дзе было прынята рашэнне аб утварэнні Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік?

2. Якія савецкія рэспублікі першымі ўвайшлі ў састаў СССР? Колькі іх цяпер? Назавіце кожную.

3. Якую плошчу займае наша краіна? Якая колькасць насельніцтва Савецкага Саюза?

4. Плошча і насельніцтва БССР?

5. Калі была прынята апошняя Канстытуцыя нашай дзяржавы?

6. Дружба і адзінства савецкага народа дапамаглі яму выйграць найцяжэйшую з войнаў у гісторыі чалавецтва. Што вы ведаеце аб удзеле беларусаў у Вялікай Айчыннай вайне?

7. Назавіце савецкія гарады-героі. Якія з гарадоў Беларусі ўдастоены гэтага звання?

8. За гады Савецкай улады непазнавальна змянілася аблічча нашай рэспублікі. Якія новыя гарады з'явіліся на карце Беларусі?

9. Да рэвалюцыі ў Беларусі не было ніводнай вышэйшай навучальнай установы. Сёння іх дзесяткі. Летась старэйшай з іх споўнілася 60 гадоў. Назавіце яе.

10. Сучасная Беларусь — рэспубліка з высокаразвітай індустрыяй. Якую прадукцыю, вядомую ў многіх краінах, выпускаюць буйнейшыя беларускія прадпрыемствы?

11. Якія вышэйшыя ўрадавыя ўзнагароды СССР і БССР вы ведаеце? Хто і за што імі адзначаецца?

12. Вышэйшым прызнаннем творчых заслуг у Краіне Саветаў з'яўляецца прысуджэнне звання «народны» — «народны пісьменнік СССР», «народны мастак СССР», «народны артыст СССР»... Каго з прадстаўнікоў беларускай культуры, удастоеных гэтага звання, вы ведаеце?

13. Сёлета па рашэнню ЮНЕСКА сусветная грамадскасць будзе адзначаць 100-годдзе з дня нараджэння класікаў беларускай літаратуры Янкі Купалы і Якуба Коласа. Назавіце месца і дату нараджэння кожнага, сапраўдныя імёны і прозвішчы. Растлумачце паходжанне іх літаратурных псеўданімаў.

14. Аднаму з вялікіх беларускіх паэтаў пастаўлены помнік далёка ад Радзімы, на другім кантыненце. Каму? Дзе і калі? Помнікі якім вялікім паэтам устаноўлены ў тым жа месцы?

15. Неглюбка, Моталь, Івянец, Жлобін. Гэтыя і многія іншыя вёскі і гарады Беларусі славяцца на ўвесь свет народнымі рамёствамі. Якія вырабы беларускіх майстроў найбольш вядомыя? На якіх міжнародных кірмашах яны дэманстраваліся?

16. У нашай краіне праводзіцца вялікая работа па ахове навакольнага асяроддзя, флоры і фауны. Якія прыродныя запаведнікі ёсць у Беларусі? Які з іх самы буйны? Чым ён славуты?

Прыняць удзел у віктарыне могуць суайчыннікі, якія стала жывуць за рубяжом, і члены іх сямей. Адказы на пытанні можна прысылаць на беларускай, рускай і на любой замежнай мове.

Для пераможцаў заснаваны наступныя прызы:

Першы — адзін. Запрашэнне Беларускага таварыства «Радзіма» наведаць нашу рэспубліку, тэрмін паездкі — 10 дзён.

Другіх — два. 1. Транзістарны прыёмнік «Акіян». 2. Наручны гадзіннік «Прамень».

Трэціх — пяць. Наборы беларускіх сувеніраў.

Пяць заахвочвальных прызоў—кнігі.

Адказы на пытанні віктарыны прысылайце па аднаму з наступных адрасоў:

БССР, г. Мінск, вул. Захарава, 23, Беларускае таварыства «Радзіма».

БССР, г. Мінск, Ленінскі праспект, 44, рэдакцыя газеты «Голас Радзімы».

Адказы прымаюцца да 1 снежня 1982 года. Вынікі віктарыны і імёны пераможцаў будуць апублікаваны ў студзені 1983 года.

ПРЭЗІДЫУМ БЕЛАРУСКАГА ТАВАРЫСТВА «РАДЗІМА»

РЭДАКЦЫЯ ГАЗЕТЫ «ГОЛАС РАДЗІМЫ»

В НЫНЕШНЕМ году наша страна — Союз Советских Социалистических Республик — отметит свое 60-летие. Этот юбилей—большой праздник для всех народов нашей многонациональной Родины. Шестидесятилетняя история Советского Союза явилась ярким примером воплощения в жизнь небывалых ранее связей между большими и малыми нациями и народностями СССР, основанных на равенстве и дружбе, породивших единство советского народа — этой новой исторической общности людей первого в мире социалистического государства. Именно единство, дружба, братская взаимопомощь дали нам возможность добиться значительных успехов во всех областях жизни, решить многие социально-политические проблемы. В единой советской семье расцвела и наша, некогда отсталая Белоруссия. Сегодня во всем мире известна ее промышленная и сельскохозяйственная продукция, художественные коллективы, ее литература и самобытное народное творчество. В связи с 60-летием образования СССР Белорусское общество «Радзіма» и редакция газеты «Голас Радзімы» предлагают зарубежным соотечественникам принять участие в викторине

ЧТО ВЫ ЗНАЕТЕ ОБ СССР?

1. Когда и где было принято решение об образовании Союза Советских Социалистических Республик?

2. Какие советские республики первыми вошли в состав СССР? Сколько их теперь? Назовите каждую.

3. Какую площадь занимает наша страна? Какова численность населения Советского Союза?

4. Площадь и население БССР?

5. Когда была принята последняя Конституция нашего государства?

6. Дружба и единство советского народа помогли ему выиграть тяжелейшую из войн в истории человечества. Что вы знаете об участии белорусов в Великой Отечественной войне?

7. Назовите советские города-герои. Какие из городов Белоруссии удостоены этого звания?

8. За годы Советской власти неузнаваемо изменился облик нашей республики. Какие новые города появились на карте Белоруссии?

9. До революции в Белоруссии не было ни одного высшего учебного заведения. Сегодня их десятки. В прошлом году старейшему из них исполнилось 60 лет. Назовите его.

10. Современная Белоруссия — республика с высокоразвитой индустрией. Какую продукцию, известную во многих странах, выпускают крупнейшие белорусские предприятия?

11. Какие высшие правительственные награды СССР и БССР вы знаете? Кто и за что ими отмечается?

12. Высшим признанием творческих заслуг в Стране Советов является присуждение звания «народный» — «народный писатель СССР», «народный художник СССР», «народный артист СССР»... Кого из представителей белорусской культуры, удостоенных этого звания, вы знаете?

13. В этом году по решению ЮНЕСКО мировая общественность будет отмечать 100-летие со дня рождения классиков белорусской литературы Янки Купалы и Якуба Коласа. Назовите место и дату рождения каждого, настоящие имена и фамилии. Объясните происхождение их литературных псевдонимов.

14. Одному из великих белорусских поэтов поставлен памятник далеко от Родины, на другом континенте. Кому? Где и когда? Памятники каким великим поэтам установлены в том же месте?

15. Неглюбка, Мотоль, Ивенец, Жлобин. Эти и многие другие деревни и города Белоруссии славятся на весь мир народными ремёслами. Какие изделия белорусских мастеров наиболее известны? На каких международных ярмарках они демонстрировались?

16. В нашей стране проводится огромная работа по охране окружающей среды, флоры и фауны. Какие природные заповедники имеются в Белоруссии? Какой из них самый крупный? Чем он знаменит?

Принять участие в викторине могут соотечественники, постоянно проживающие за рубежом, и члены их семей. Ответы на вопросы можно присылать на белорусском, русском и на любом иностранном языке.

Для победителей учреждены следующие призы:

Первый — один. Приглашение Белорусского общества «Радзіма» посетить нашу республику, срок поездки — 10 дней.

Вторых — два. 1. Транзисторный приемник «Океан». 2. Наручные часы «Луч».

Третьих — пять. Наборы белорусских сувениров.

Пять поощрительных призов — книги.

Ответы на вопросы викторины присылайте по одному из следующих адресов:

БССР, г. Минск, ул. Захарова, 23, Белорусское общество «Радзіма».

БССР, г. Минск, Ленинский проспект, 44, редакция газеты «Голас Радзімы».

Ответы принимаются до 1 декабря 1982 года. Результаты викторины и имена победителей будут опубликованы в январе 1983 года.

ПРЕЗИДИУМ БЕЛОРУССКОГО ОБЩЕСТВА «РАДЗІМА»

РЕДАКЦИЯ ГАЗЕТЫ «ГОЛАС РАДЗІМЫ».

Віталь КАРОЦІЧ: «БЕЛАРУСЫ — НАРОД СУЧАСНЫ»

ЗАДАЧЫ СКЛАДАНЫЯ І МАШТАБНЫЯ

Адбыўся пленум Саюза пісьменнікаў нашай рэспублікі, на якім абмяркоўваліся праблемы і перспектывы мастацкай публіцыстыкі. Як вядома, жанр гэты ў беларускай літаратуры бярэ свой пачатак яшчэ з творчасці такіх вядомых майстроў слова, як Максім Багдановіч, Янка Купала, Якуб Колас, Цішка Гартны, Максім Гарэцкі, Кузьма Чорны... Нарыс, публіцыстычны артыкул, фельетон, эсэ з'яўляліся для іх, як і для наступных пакаленняў беларускіх пісьменнікаў, першапачатковай формай спазнання і асэнсавання рэчаіснасці.

Шматлікія ўдзельнікі дыскусіі адзначалі, што і цяпер перад мастацкай публіцыстыкай стаяць складаныя, і маштабныя задачы. Пісьменнікам даверана ствараць калектыўны партрэт нашага сучасніка, раскрываць усё багацце і прыгажосць яго характару, расказваць пра веліч стваральнай працы.

На пленуме прысутнічала дэлегацыя Саюза пісьменнікаў СССР, якую ўзначальваў сакратар праўлення СП СССР, украінскі паэт Віталь Кароціч.

— Якія думкі асабіста ў вас выклікала размова, што вялася на пленуме?—у перапынку паміж пасяджэннямі спыталі мы ў нашага украінскага сябра.

— Доўгія гады пасля вайны беларуская літаратура ўспрымалася як літаратура ваеннай тэмы. Лёс народа ў полымі вайны. Цяпер вядучае месца ў ёй займаюць тэмы стваральныя, праблемы горада і вёскі, фарміраванне асобы чалавека новага сацыялістычнага грамадства.

Такая тэма—мастацкая публіцыстыка—абмяркоўваецца пісьменнікамі ўпершыню, і не толькі ў Беларусі, а і наогул у краіне. Мне здаецца, тут зроблена спроба асэнсаваць магчымасці пісьменніка па-за межамі яго спецыфічна літаратурнай працы.

— Яшчэ адно пытанне. Ужо не звязанае непасрэдна з мэтай вашага прыезду ў Мінск. Вы ўпершыню ў нашым горадзе?

— Мне самому дзіўна, але так увесь час складваліся абставіны. Хаця сувязі паміж беларускімі і ўкраінскімі літаратарамі даўнія і вельмі цесныя. Мы часта абменьваемся дэлегацыямі. Зімой праводзілі ўрачысты вечар, прысвечаны 90-годдзю М. Багдановіча. Многа робіцца перакладаў з беларускай на ўкраінскую мову. Перакладзены Янка Купала, Якуб Колас, з сучасных—Янка Брыль, Рыгор Барадулін, Васіль Быкаў. Вядома, і ўкраінская літаратура шырока перакладаецца на вашу мову. Мяне вось таксама перакладалі даволі многа—Ніл Гілевіч, Генадзь Бураўкін.

— Ну, а якое наогул у вас уражанне ад нас, беларусаў?

— Вельмі сучасны народ. Выдавецкае жыццё надзвычай паўнакроўнае. І яшчэ вось пра што хацеў бы сказаць. Мне многа даводзілася ездзіць па свеце. Неаднойчы сустракаў у розных краінах прыкметы Беларусі. Напрыклад, вельмі ўзрадаваўся Янку Купалу ў Араў-Парку, вашаму трактару на канадскіх палях. Бачыў там і беларусаў. Як і ўкраінцам, ім цяжка і журботна ўдалечыні ад дому. Ніколі не забуду чаргі каля будынка ў Нью-Йорку, дзе дэманстраваліся савецкія фільмы. Стаялі ў асноўным эмігранты. Іх прывяла туды туга па роднай зямлі...

В. ВЯРХОЎСКАЯ.

ВОБРАЗЫ МІЛЫЯ РОДНАГА КРАЮ

МІКАЛАЕЎШЧЫНА

У 1555 г. Рыгор Сырпуцевіч прадаў вёску Мікалаеўшчыну князю Лукашу Свірскаму. Людзі Мікалая Крыштупа Радзівіла рабілі частыя наезды і чынілі крыўды падданым князя Свірскага ў Мікалаеўшчыне. Спрэчкі князёў з-за межаў зямельных уладанняў часта перарасталі ў судовыя працэсы. Пасля смерці Лукаша Свірскага ягоны сын Крыштуп у 1596 г. прадаў Мікалаеўшчыну князю Радзівілу за 2 000 коп літоўскіх грошаў. З гэтага часу Мікалаеўшчынай распараджаліся Радзівілы, аддаючы яе на закладное ўладанне тым ці іншым уласнікам. У нясвіжскую ардынацыю Мікалаеўшчына ўваходзіла да 1861 г.

У польскім геаграфічным слоўніку 1885 г. адзначана: «Мікалаеўшчына, малое мястэчка, у мінулым належала Радзівілам, у збегу Турчанкі з Нёманам, на паўднёвай ускраіне Мінскага павета, паміж мястэчкамі Магільна і Новы Свержань, каля 100 хат, царква перароблена з парафіяльнага каталіцкага касцёла (Наднёманскага дэканату), пабудаванага на сродкі Радзівіла. Касцёл скасаваны ў 1866 г.»

Бацька і маці Якуба Коласа былі родам з Мікалаеўшчыны. Тут крэўная продкаўшчына народнага паэта. Радаводная песняра выяўлена па архіўных дакументах, копіях метрык мікалаеўскага касцёла. Коласавы продкі з боку бацькі і маці былі прыгонныя сяляне. У «Новай зямлі» паэт пісаў:

Каротка памятка аб людзе,
Аб простым людзе.
І такая
Ўсім бедным доля выпадае:
Прайсці свой круг, прамарнавацца
І невядомымі астацца
Ды быць забытымі тут ўсімі —
І сваякамі і чужымі.

З копій метрык на лацінскай мове мікалаеўскага касцёла даведваемся: «18 верасня 1797 г. пахаваны на мікалаеўскім парафіяльным могільніку прыгонны Лявон Міцкевіч, векам 41 год, жанаты, выспавяданы, спасілены святымі сакрамэнтамі...» Прапрадзед паэта пакінуў жонку Рэгіну, дачку Ружыну, сыноў Міколу і Станіслава.

Мікола Міцкевіч — прадзед беларускага песняра.

Коласаў дзед Казімір Міцкевіч узяў шлюб з Ганнай Белай. Пра гэта чытаем у копіі шлюбных метрык за 1835—1841 гады. «14 ліпеня 1840 года ў Мікалаеўскім рымска-каталіцкім парафіяльным касцёле ксёндз Феліцыян Калантай па трох запаведзях пабагаславіў сужэнства прыгонных Казіміра Міцкевіча, юнака 20-ці гадоў, сына Мікалая і Дамінікі з Лойкаў, і Ганны Белай, дзяўчыны 22 гадоў, дачкі Пятра і Агаты з Лойкаў...»

У Казіміра і Ганны Міцкевічаў, як сведчаць хросныя метрыкі, былі дзеці — Пятрусь, Магда, Яхім, Каруся, Ігнась, Кацярына, Антось.

Дакладная дата нараджэння Міхала Міцкевіча, бацькі Якуба Коласа, па хросных метрыках не выяўлена. У рэвізскай ведамасці за 25 мая 1858 г. пазначана, што яму тры гады. Паводле «Службовага фармуляру лясной варты Акінчыцкага лясніцтва на 1884-5 год», Міхал Міцкевіч мае 34 гады. Бацька Якуба Коласа памёр 8 лютага 1902 г.

Язэп Лёсік — прадзед Якуба Коласа з боку маці. З копіі метрыкі вынікае, што жонка Язэпа Лёсіка Альжбета памерла ў 1823 г. Пражыла яна 28 гадоў. У сям'і прыгонных Язэпа Лёсіка і Альжбеты было трое дзяцей — Вінцэсь, Адам, Людвік. З другога шлюбу Язэпа Лёсіка з Даміцэляй Галавачанкай нарадзіліся сыны Людвік, Карусь, Матэвуш, Юрка і дачка Ганна. Юрка Лёсік — дзед народнага паэта з боку маці.

З метрычнай кнігі за 1849—1862 гады відаць, што ў прыгонных сялян Юркі і Хрысціны Лёсікаў 8 верасня 1857 г. нарадзілася дачка. Назвалі яе Ганнай. Ганна Лёсік — маці Якуба Коласа.

Бацькі і сваякі паэта сталі прататыпамі герояў коласавай паэмы «Новая зямля»—Міхал, Ганна, цётка Магда, дзядзька Антось, дзед Юрка.

Прозвішчы продкаў песняра сустракаюцца і ў іншых архіўных матэрыялах. У Цэнтральным дзяржаўным гістарычным архіве БССР у Мінску захоўваецца «Справа пра высечку лесу сялянамі вёскі Мікалаеўшчына», заведзеная 11 студзеня 1863 г. галоўнай управай нясвіжскіх ардынацкіх маёнткаў князёў Радзівілаў. Сяляне-мікалаеўцы ў 1863—1864 гг. высеклі лес паміж палянак, што адышлі пад іх надзел. Плошча высечанага лесу пры падліку склала 74 дзесяціны 919 сажняў. Сяляне тлумачылі міравому пасрэдніку 3-га ўчастка Мінскага павета, што гэтая зямля належала ім здаўна. Радзівілаўская адміністрацыя палічыла высечку за гвалтоўнае знішчэнне ардынацкіх лясоў. 27 верасня 1867 г. распачалося следства. Прысяжныя сведкі ацанілі высечаны лес на суму 3 840 рублёў серабром. У пратаколе дазнання, праведзенага 9 кастрычніка 1867 г., значацца Казімір Міцкевіч, дзед Якуба Коласа, і Мацей Лёсік—брат Юркі Лёсіка, Коласавага дзеда па маці.

Мінаў час, грошы ў нясвіжскую касу князя Радзівіла не паступалі. Мінскае павятовае паліцэйскае кіраўніцтва, беручы пад увагу рапарт прыстава, прасіла губернскую ўправу дазволіць апісанне і продаж рухомай маёмасці сялян вёскі Мікалаеўшчына. Нясвіжская адміністрацыя ўвесь час клапацілася пра тое, каб справе як мага хутчэй далі рух, прадугледжаны законам. Вопіс рухомай маёмасці быў складзены прыставам 15 чэрвеня 1877 г. Ацэнку давалі пасля прысягі трое сялян, за іх, як непісьменных, распісаўся свяшчэннік. Усю апісаную маёмасць пад нагляд і адказнасць прыняў мікалаеўскі сельскі стараста Юрка Лёсік.

Агульная сума апісанага жывога інвентару склала 2 608 рублёў. Рухомая маёмасць Казіміра Міцкевіча выглядала гэткім чынам: конь — 20 руб., дзве каровы па 10 руб., тры авечкі па 1 руб. 50 кап. Усяго на суму 44 руб. 50 кап. Агульная ж сума штрафу складала 101 руб. 50 кап.

Сяляне падалі апеляцыйную скаргу ў сенат на рашэнне мінскай злучанай палаты крымінальнага і цывільнага суда. Яны тлумачылі, што секлі лес яшчэ да прызнання яго ўласнасцю Радзівілаў, і прытым з дазволу міравога пасрэдніка. Нясвіжская адміністрацыя імкнулася паскорыць продаж рухомай маёмасці сялян. Паводле рапарту ляснічага К. Сянкевіча за 25 жніўня 1878 г., торг, прызначаны на 24 жніўня, не адбыўся ў Мікалаеўшчыне з прычыны супраціўлення сялян паліцыі. Прыставам быў дасланы ў губернскую ўстанову акт на разгляд і распараджэнне вышэйшай улады.

У чарговым рапарце ляснічага ў кантору галоўнага кіраўніцтва маёнткамі князя Радзівіла паведамлялася, што ў прысутнасці таварыша пракурора, судовага следчага, павятовага спраўніка і станавога прыстава адбыўся продаж рухомай маёмасці сялян вёскі Мікалаеўшчына. Выручка ад продажу, як інфармавалі ляснічага паліцэйскі ўраднік і валасны пісар, была на 206 рублёў з капейкамі.

У 1886 годзе ўсіх жыхароў Мікалаеўшчыны далучылі да праваслаўнай царквы. У падпісцы за 26 ліпеня 1866 г. сярод сялян уласнікаў (так па рэформе 1861 г. называліся колішнія памешчыцкія сяляне) значыцца сям'я Коласавага дзеда па бацьку: Казімір Мікалаеў Міцкевіч, яго маці Домна, жонка Ганна, дзеці іх — Яхім, Міхал, Антось, Павел, Магда, Каруся і Кацярына. У падпісцы за 27 ліпеня 1866 г. таксама сярод сялян уласнікаў запісаны Мацей Язэпаў Лёсік, жонка яго Караліна, сыны — Антось, Казімір, Мацей, дочкі — Міхаліна, Антаніна; Мацея брат Юрка (Коласаў дзед па маці), жонка яго Хрысціна, сыны іх — Пятрусь, Ігнась, дочкі—Ганна, Магда. У падпісках выказаны сялянамі іх «рашучы намер» далучыцца да праваслаўнай веры, а таксама просьба пераабсталяваць касцёл з усімі прыдатнымі рэчамі і абразамі на праваслаўную царкву і адчыніць пры ёй народнае вучылішча.

Народнае вучылішча ў Мікалаеўшчыне пачало працаваць у 1866 годзе. Кастусь Міцкевіч, будучы народны паэт, вучыўся ў ім у 1892—1894 гадах (паводле іншых звестак у 1893—1895 гадах).

У артыкуле «Васемнаццатая гадавіна» Якуб Колас згадваў: «Я жыва ўяўляю сабе нашу старэнькую мікалаеўскую школу з прыгожым ганачкам і двума пабеленымі слупамі. З гэтаю школаю цесна звязаны многія моманты майго жыцця. Яна рабіла на мяне моцнае ўражанне адметным сваім ад сялянскіх хат выглядам, з двухгаловым арлом і роўнымі радочкамі літараў на вывесцы, калі малым хлапчуком праходзіў я міма школы, дзе жыў страшны для мяне настаўнік. Са страхам ступаў я на яе парог, будучы вучнем; быў у ёй многа разоў па сканчэнні семінарыі, асабліва ў той час, калі там быў настаўнікам мой сябра і зямляк А. Сянкевіч. Быў час, калі ў ёй бурліла маладое жыццё і замысляліся розныя планы патаемна ад паліцэйскага вока. Гэта былі часы першых рэвалюцыйных громаў 1905—1906 гадоў. Гэта быў галоўны штаб рэвалюцыйна настроенага маладога настаўніцтва».

Тут, у школе, адбыўся нелегальны настаўніцкі з'езд, назначаны на 9 ліпеня 1906 г. Праходзіў ён днём у Прыстаньцы, на беразе Нёмана, а ўвечары настаўнікі, вярнуўшыся ў школу, падпісалі пратакол. «У гадзін 12 ночы раптам уляцеў ураднік у кватэру настаўніка і з крыкам «ні з месца!», як каршун, наляцеў на наш пратакол,— успамінаў Якуб Колас.— Следам уварваліся сюды паліцэйскія стражнікі на чале з прыставам. Закамандавалі падняць «рукі ўгору» і пайшлі трэсці нашы кішэні і шукаць па ўсіх кутках «крамолы».

У Цэнтральным дзяржаўным гістарычным архіве БССР у Мінску захоўваецца «Інвентарнае апісанне карчомных пабудоў з участкам зямлі ў вёсцы Мікалаеўшчыне і засценку Русаковічах, складзенае 1 лютага 1893 г. Па дакументах, унутры карчмы былі чатыры асобныя пакоі, якія абаграваліся печчу з камінкам.

У трылогіі «На ростанях» Якуб Колас пісаў: «Крайнім будынкам ад Нёмана супраць броду была старая карчма на высозным падмурку. Калісь гэта быў вір сялянскага жыцця, і не адна мікуціцкая душа захлынулася ў ім. З таго часу, як увялі манапольку, карчма заняпала, а потым згарэла. Але па старой звычцы збіраўся тут народ, як на старадаўняе веча, дзе вырашаліся сялянскія справы і разважалі аб розных пытаннях мікуціцкага побыту».

У колішнюю карчму перабралася з Цёмных Лядаў Коласава маці з сям'ёю. Сюды накіраваўся Якуб Колас з маёнтка Габрылева-Папоўка Сенненскага павета Магілёўскай губерні, дзе ён працаваў з пачатку 1908 г. настаўнікам першай беларускай прыватнай школы, заснаванай К. Гардзялкоўскім. «Вясною 1908 г.,— успамінаў Якуб Колас,—я паехаў на Нёман, у вёску Мікалаеўшчына, дзе жылі тады мае родныя. Я хадзіў на зборышчы сялян... Аб усім гаварылі нашы людзі. Іх гутаркі для мяне былі жывым матэрыялам. Я пісаў фельетоны, карэспандэнцыі, вершы, апавяданні. Мяне ідэйна падтрымліваў, натхняў і радаваў паэтычны талент Янкі Купалы... У тым жа 1908 годзе, у канцы лета, мне была ўручана павестка — прыбыць на суд Віленскай судовай палаты ў г. Мінск 15 верасня. Суд адбыўся. Засудзілі мяне на тры гады заключэння ў крэпасць».

Генадзь ТУМАС.

НА ЗДЫМКУ: малюнак-рэканструкцыя карчмы ў Мікалаеўшчыне, зроблены мастаком М. КУПАВАМ.

НОВЫ БАЛЕТ ЯЎГЕНА ГЛЕБАВА ПАСТАЎЛЕНЫ Ў ФІНЛЯНДЫІ

АДКАЗВАЦЬ ЗА ЖЫЦЦЁ НА ЗЯМЛІ

Здаецца, не так даўно, усяго чатыры гады назад, у Фінляндыі быў пастаўлены балет беларускага кампазітара Яўгена Глебава «Ціль Уленшпігель». Яго вельмі прыхільна сустрэлі гледачы, сталічная фінская прэса адзначала, што спектакль садзейнічаў збліжэнню нашых краін, духоўнаму ўзаемаразуменню паміж народамі СССР і Фінляндыі. І вось прыемная вестка. У Хельсінкі, у Фінскім нацыянальным оперным тэатры, адбылася прэм'ера новага балета Я. Глебава «Маленькі Прынц».

Наш карэспандэнт сустрэўся з народным артыстам БССР, кампазітарам **Яўгенам ГЛЕБАВЫМ.**

— Яўген Аляксандравіч, як фінскія гледачы сустрэлі ваш новы балет?

— Мне давялося прысутнічаць на двух першых паказах. Публіка там наогул вельмі патрабавальная, нават прыдзірлівая, стрыманая. Мяркуйце самі: ёсць людзі, якія 10—20 гадоў займаюць у зале адно і тое ж месца. На спектакль былі запрошаны прадстаўнікі розных пасольстваў. Мы разам з балетмайстрам - пастаноўшчыкам Эльзай Сюльвестэрсан вельмі хваляваліся. ...І тройчы пад апладысменты выходзілі на сцэну. А на другім спектаклі, дзе было больш моладзі, дзяцей, апладысменты чуліся неаднойчы на працягу дзеі. Дадам, што білеты на балет, якія, дарэчы, каштуюць там не так ужо і танна, прададзены да канца сезона.

— Наколькі я ведаю, партытура новага балета была поўнасцю закончана вамі восенню мінулага года. Але задумалі вы яго даволі даўно. Мусіць, яшчэ да стварэння сімфанічнай паэмы «Казка», якая была своеасаблівым эскізам да будучага балета?

— Амаль сем гадоў прайшло з таго часу, як упершыню ўзнікла думка ўвасобіць у музыцы вобразы герояў сусветна вядомага твора Экзюперы: Прынца, Лётчыка, Ліса, Ружы, Ганарліўца, Дзялка... Мне падалася вельмі цікавай ідэя гэтага твора. Памятаеце, Прынц разважае прыкладна так: «Што за людзі гэтыя дарослыя! Дробязь здаецца ім важнай справай, а галоўнага яны не бачаць. Замест таго, каб упрыгожваць свой дом, сваю планету, яны ваююць, прыгнечваюць іншых людзей...» Нават у самыя цяжкія хвіліны мой маленькі герой не губляе веры ў перамогу дабра, шукае ўзаемаразумення, сяброўства. Што, дарэчы, так неабходна цяпер усім народам планеты.

Пісаў музыку з думкай пра наш сённяшні час. Імкнуўся стварыць балет, які б усхваляваў людзей, прымусіў задумацца над тым, як гэта важна, як неабходна адказваць за жыццё на зямлі.

— Аднойчы вы казалі, што ўспрымаеце аповесць Экзюперы як філасофскі запавет пісьменніка будучым пакаленням, перасцярогу ад таго зла, якое заўсёды гатова паказаць сілу, перасцярогу вайне...

— Была вайна. І я быў хлопчыкам. Нялёгкія ўспаміны дзяцінства. Гэта ўжо мой уласны вопыт. Можа менавіта таму мне так сімпатычны безабаронны маленькі Прынц, як, наогул, безабаронныя ўсе дзеці. І я мусіў пісаць музыку, навеяную ўспамінамі ўласнага дзяцінства, успамінамі пра Прынца: прасветленую і трывожна-шчымлівую, дзе смутак і боль перапляліся...

— Хацелася б, каб вы трохі расказалі пра сваю творчую садружнасць з Эльзай Сюльвестэрсан, якая паставіла «Маленькага Прынца». Ці ў суладдзі музыка і танец?

— Эльза Сюльвестэрсан — вядомы харэограф, сама ў мінулым балерына. Дарэчы, яна руская па паходжанню, яе бацькі жылі пад Ленінградам. З трыццаці спектакляў, што паставіла Эльза,— большая частка нашы айчынныя. Вялікая патрыётка сваёй Радзімы, яна ўсяляк садзейнічае таму, каб фіны пазнаёміліся з савецкім мастацтвам, адчулі яго, наогул, зразумелі імкненні нашага народа. Эльза з'яўляецца членам таварыства «Фінляндыя — СССР», сястра яе член праўлення гэтага ж таварыства, камуністка. А сын Эльзы Петэр, нядрэнна размаўляе на рускай мове. Так што ў нас з харэографам не было ніякіх праблем, хаця мы грамадзяне розных краін. Эльза адчувае маю музыку душой. І гэта цудоўна. Яна ж прапанавала галоўную ролю Прынца даручыць хлопчыкам, вучням сталічнай дзіцячай харэаграфічнай школы Петры Тойванену і Юліусу Куусісхолма, якія выдатна справіліся са сваёй задачай. На вачах у гледачоў з'яўляліся слёзы — столькі эмацыянальнасці, шчырасці прыўнеслі ў спектакль гэтыя юныя выканаўцы.

— Я бачу ў вас на стале цэлы стос фінскіх газет і часопісаў. У іх — рэцэнзіі на прэм'еру. Якое ўражанне ад гэтых публікацый?

— Здаецца, ні адна фінская газета не засталася ў баку ад гэтай падзеі. Фіны вельмі ганарацца тым, што менавіта ў іх пастаўлены першы ў свеце балет па творы Антуана дэ Сент-Экзюперы. Яны нават пазначылі ў афішы спектакля: «Сусветная прэм'ера». На прэс-канферэнцыі, якая адбылася напярэдадні прэм'еры, я адказваў на шматлікія пытанні журналістаў, якіх цікавілі не толькі мае адносіны да мастацтва, але і да праблем сённяшняга жыцця. І гэта мне зразумела. Бо на Захадзе вельмі нярэдка з'яўляюцца творы мастацтва, пазбаўленыя думкі, усялякай ідэі, нават сэнсу. Эксперыменты дзеля эксперыментаў. Праглядаючы потым прэсу, я адзначыў добразычлівасць газет. Яны былі аб'ектыўнымі ў сваіх каментарыях да балета.

Інтэрв'ю ўзяла Таццяна АНТОНАВА.

Адметнай рысай творчага почырку мастака Аляксандра ЗІМЕНКІ з'яўляецца імкненне да арганічнага спалучэння сучаснай праблематыкі і традыцыйных прыёмаў керамікі. За дзесяць гадоў ён стварыў шмат станковых і манументальна-дэкаратыўных твораў, у тым ліку афармленне беларускага аддзялення АДН, атэля «Турыст», рэстарана «Заслаўе», вітрын магазіна-салона Мастацкага фонду БССР і многія іншыя.
НА ЗДЫМКУ: А. ЗІМЕНКА разам з архітэктарам А. САРДАРАВЫМ працуе над праектам афармлення аўтамабільных дарог на радзіму Якуба Коласа і Янкі Купалы.

Фота Д. ІЛЬІНА.

КІНАФІЛЬМ ПРА ПАЛЕССЕ 30-х ГАДОЎ

«ЛЮДЗІ НА БАЛОЦЕ»

Найперш у залу струменьчыкам пралілася старадаўняя народная песня, праспяваная маладым і пругкім дзявочым голасам. Следам на шырокім экране з'явіўся выгнуты ў кола далягляд, поўны шэрай балотнай вады, з якой сям-там проста ў спякотнае летняе неба тарчалі мокрыя дрэвы і голы, бязлісты хмызняк... Зняты шырокавугольным аб'ектывам, гэты палескі краявід выглядаў круглым, адмежаваным ад усяго свету кутком прыроды.

«Хаты былі на востраве. Востраў гэты, праўда, не кожны прызнаў бы за востраў — аб яго не плёскаліся ні марскія, ні нават азёрныя хвалі. Навокал адно гніла куп'істая дрыгва ды моклі панурыя лясы».

Так пачынаецца вядомы раман лаўрэата Ленінскай прэміі Івана Мележа «Людзі на балоце», так пачынаецца і аднайменны фільм, зняты летась народным артыстам БССР Віктарам Туравым на кінастудыі «Беларусьфільм».

— Вядома, што вёскі, падобныя да Куранёў, як іх адлюстраваў І. Мележ, даўно ўжо адышлі ў мінулае,— заўважыў рэжысёр.— Іх аблічча нам давялося рупліва ствараць нанова. У адной з палескіх вёсак па эскізах мастака Я. Ігнацьева мы пабудавалі вуліцу, многія натурныя здымкі рабіліся ў пінскіх балотах і Бярэзінскім заказніку, дзе ў некранутым выглядзе захавалася прырода.

А ў гэтых хатах, на адным канцы вёскі, жывуць ціхі гаспадарлівы хлопец Васіль і зграбная прыгажуня Ганна Чарнушка. Толькі-толькі зразумелі яны, што ўжо не дзеці, і пацягнуліся адзін да аднаго. Усяго пару разоў пастаялі да ночы за гародамі, баючыся нат датыкнуцца адзін да аднаго, нат слова не тое сказаць, усяго адзін світанак разам спаткалі, а ў іх кволае яшчэ шчасце ўжо ўрываецца бязлітаснае, практычнае жыццё. Васіль пад пагрозай смерці вымушаны паказаць бандытам-маслакоўцам хату вясковага актывіста Ахрэма Грыбка. І за гэта пад вартай адпраўляецца ў турму, пакідаючы Ганулі першыя ваганні, першую глыбокую пакуту. Вяртаецца Васіль без былога бляску ў вачах, змрочны, злы на ўвесь свет і на сябе самога. Ён адразу верыць злым языкам, якія данеслі гідкую хлусню, быццам сын заможнага селяніна Глушака Яўхім зняславіў Ганну...

Каханне яшчэ вернецца да Васіля, ляжа нялёгкай пячаткай на ўсё ягонае жыццё, узмоцніцца і стане сапраўдным, адзіным. Але тады будзе позна, бо ўжо сёння, зараз бацькі выдаюць пакрыўджаную недаверам каханага, але поўную дзявочай годнасці Ганну за Яўхіма. Маўляў, у каго грошы — той і сам харошы. Выдаюць у поўнае гора і слёз замужняе жыццё.

А між тым у Куранях ідзе складаны і супярэчлівы працэс калектывізацыі. Трэба па справядлівасці раздзяліць зямлю, а людзі баяцца, што прыйдзе з лесу Маслак, пакарае. Баяцца старога Глушака, які сваім багаццем і прагнасцю моцна трымае ў руках вяскоўцаў.

Трэба са светам звязацца, а для гэтага—пабудаваць грэблю праз дрыгву. Але адны кажуць — хай новая ўлада сама будуе, бо гэта ёй трэба. Другія — навошта будаваць? Продкі, маўляў, без грэблі жылі, і мы пражывём...

Паступова час і настойлівасць, паслядоўнасць змагароў за новы лад бяруць сваё. Выганяюць з лесу Маслака, дзеляць самую ўрадлівую ў Куранях зямлю Глушака, усёй вёскай выходзяць пракладаць грэблю...

Прыемна здзіўляе ў фільме тое, што натуральныя вобразы палешукоў з вёскі Курані стварылі зусім «гарадскія» артысты беларускіх тэатраў: Алена Барзова — прыгожай і поўнай жаночай годнасці Ганулі, Юрый Казючыц — працавітага і сарамлівага Васіля, які, здаецца, вось-вось схавае вочы і пачырванее, Барыс Няўзораў — нахабнага і самаўпэўненага за шырокай спіной заможнага бацькі Яўхіма, Яўген Ілавайскі — энергічнага і каларытнага Апейкі. Цікава, што ў тэатры імя Янкі Купалы ў спектаклі «Людзі на балоце» доўгі час ролі Васіля і Ганны выконвалі Генадзь Гарбук і Лілія Давідовіч. У фільме яны стварылі вобразы старэйшых: Гарбук — Чарнушкі-бацькі, Давідовіч — Глушачыхі.

Новая стужка В. Турава ўражвае яшчэ і дакладнасцю агульнай атмасферы 30-х гадоў, якая ствараецца на сучаснай кінамове (аператар Зміцер Зайцаў) проста, шчыра. Кожная дэталь на экране: і пабудовы, і народныя строі, і прылады працы, і сама палеская мова — жывыя, сапраўдныя, далёкія ад музейнасці...

Сюжэт фільма застаецца як бы незавершаным — лёсы людзей яшчэ не вызначыліся, яны ў руху, «Людзі на балоце» — толькі пачатак трылогіі Івана Мележа, якая носіць агульную назву «Палеская хроніка». А Віктар Тураў не збіраецца пакідаць гэтую тэму.

— Яшчэ ў часе працы над сцэнарыем,— гаворыць ён,— я проста-такі «захварэў» творамі Мележа. Закарцела экранізаваць і другую яго кнігу «Подых навальніцы»...

Сяргей ДУБАВЕЦ.

ПЛАСЦІНКІ ФІРМЫ «МЕЛОДИЯ»

Многім музыкантам краіны — кампазітарам і выканаўцам — добра знаёмы дом на вуліцы Станкевіча ў Маскве, дзе размяшчаецца студыя грамзапісу ўсесаюзнай фірмы «Мелодия».

Вялікімі тыражамі разышліся запісаныя тут пласцінкі з творамі, выкананымі Дзяржаўнай акадэмічнай харавой капэлай БССР, Дзяржаўным народным аркестрам БССР, хорам Беларускага радыё і тэлебачання, Дзяржаўным народным хорам БССР, а таксама з творамі кампазітараў Я. Глебава, Г. Вагнера, песнямі, арыямі з опер у выкананні Т. Шымко, І. Сарокіна, С. Данілюк, Л. Коласа, М. Здановіч і многіх іншых беларускіх спевакоў.

Асаблівай папулярнасцю карыстаюцца выпушчаныя вялікімі тыражамі пласцінкі з запісамі песень І. Лучанка, твораў у выкананні ансамбляў «Песняры», «Сябры», «Верасы».

Добрым падарункам для аматараў музыкі сталі летась пласцінкі «Юнацтва камсамольскае маё», на якой сабраны маладзёжныя песні І. Лучанка, Ю. Семянякі, Д. Смольскага і іншых кампазітараў у выкананні салістаў і эстрадных калектываў рэспублікі, і «Мінскі сувенір» з запісамі песень у выкананні Дзяржаўнага аркестра БССР, Дзяржаўнага народнага хору БССР і ансамбля «Песняры».

Цікавасць таксама выклічуць пласцінкі з запісамі беларускіх народных песень у апрацоўцы і выкананні ленінградскай фальклорнай групы «Яблык» і песень кампазітара А. Іванова ў выкананні ансамбля «Сябры».

Дзве прыгожа афармленыя пласцінкі фірма «Мелодия» выпускае да юбілеяў народных паэтаў Беларусі Янкі Купалы і Якуба Коласа.

КРЫГАХОД НА ПРЫПЯЦІ

Як ліловая галінка бэзу, ляжыць Прыпяць на зямлі Палесся. Яе сцяблінкі — шматлікія рэчкі і рачулкі. Піна і Ясельда, Цна і Гарынь, Случ і Бобрык, Пціч і Лань... На сцяблінках рэк гняздзяцца гарады і вёскі. Гэта прамысловы Пінск і старажытны Тураў, рамантычны Давыд-Гарадок і гарысты Мазыр...

І вось на Прыпяць прыйшла вясна. Здавалася, што недзе непадалёк яна даўно хавалася і чакала, каб раптам абрынуцца нястрымнай сілай сонечных праменяў, птушыным шчабятаннем і разлеглым рэхам прыпяцкага крыгаходу.

Яшчэ зранку рассеялася, спаўзла кудысьці за небасхіл бялявая смуга. Зайграла сонца. Лозы, што ўчора тарчалі з лёду, як стальныя дроціны, памякчэлі, заспружынілі пад ветрам, запахлі ракой. Вольна, нават гарэзліва захісталіся касмылі леташняй травы. Асляпляльна заблішчэла на сонцы сасновая трэска, што ўсю зіму праляжала ў лёдавым сховішчы. Пярэсты кот — белае з чорным — залез на кроквы недабудаванай хаты і старанна мыў лапай пыску.

Загаманіла Прыпяць. Спачатку далятаў сюды толькі глухі далёкі грукат — нібыта вышэй па рацэ вялікі і цяжкі абоз едзе па драўляным мосце. Паступова гэты грукат набліжаўся, рабіўся больш выразным. Усё часцей і часцей уздрыгвалі прыбярэжныя таполі і вербы, узнімаючы з вершалін крыклівыя чародкі гракоў.

Па бліскучым мокрым лёдзе яшчэ коўзаліся бесклапотныя і гаманлівыя, як тыя гракі, хлапчукі. Занятыя гульнёй, яны не звярталі ніякай увагі на тое, што іх чаравікі і валёнкі даўно прамоклі, што лёд трэскаецца, а на яго паверхню паступае вада. Хлапчукі весела ганялі ржавую бляшанку, высока ўзнімаючы сярэбраныя пырскі.

Раптам хлапчукоў быццам ветрам здзьмула. І адразу недзе зусім блізка пачуўся магутны трэск. Раку на цэлыя кіламетры прарэзалі вялікія трэшчыны.

О, гэтыя маленькія палешукі! Усё іх жыццё, ад самых першых крокаў, звязана з Прыпяццю. Яны добра ведаюць звычкі сваёй ракі, па самых маленькіх прыкметах, недаступных слыху і воку чужога чалавека, беспамылкова вызначаюць, калі і адкуль чакаць небяспекі.

Трэшчыны паступова шырыліся, зліваліся адна з другою, утвараючы рознай велічыні і формы крыгі, якія аддзяліўшыся ад зімовага маналіту, пачыналі самастойнае жыццё. Спачатку крыгі лёгенька штурхаліся. Але, відаць, яны ўвабралі ў сябе неспакойны нораў сваёй Прыпяці-маці, і таму ніхто нікому не хацеў саступаць дарогі. Больш буйныя наляталі на меншыя, тыя «агрызаліся», але, не маючы сілы спрачацца з большымі, у шаленстве накідваліся на меншых за сябе. Паветра скаланаў трэск, грукат.

На высокую таполю, што стаяла, утыркнуўшыся тоўстым камлём у ваду, сеў шпак. Ён уладкаваўся на самай вершаліне і нагадваў трапяткі камячок. Галінка дробна трымцела, а гукі шпачынай песні не мог заглушыць нават шум крыгаходу.

Паступова на Прыпяці стала цішэй. Крыгі жвава круціліся, іх падхоплівала плынь і несла, несла...

Вясна на Прыпяці набірала сілу.

Уладзімір АЛЯХНОВІЧ.

У вашу калекцыю

На працягу шэрагу гадоў Міністэрства сувязі СССР выпускае серыі марак з рэпрадукцыямі твораў сусветна вядомых майстроў пэндзля, чые работы захоўваюцца ў музеях нашай краіны. Сярод гэтых выпускаў вялікая колькасць прысвечана аднаму з буйнейшых музеяў свету — Дзяржаўнаму Эрмітажу. 46 марак, 5 блокаў, канверты, спецыяльныя гашэнні — усе гэтыя паштовыя сувеніры можна аб'яднаць у вялікую калекцыю «Эрмітаж і філатэлія».

Будынак ленінградскага Эрмітажа, пабудаваны па праекту В. Растрэлі, паказаны на некалькіх паштовых марках, якія былі выпушчаны ў 1948—1970 гадах. Першы камплект мініяцюр з адлюстраваннем шэдэўраў Эрмітажа пошта СССР выпусціла ў 1966 годзе. На буйнафарматных марках паказаны працы старажытных майстроў — чаканная пластыка «Залаты алень» — узор скіфскага мастацтва, сярэбраны збан старажытных майстроў Ірана, малахітавая ваза XIX стагоддзя і славутая статуя Вальтэра работы Гудона. Наступныя маляўнічыя серыі марак знаёмяць шматлікіх філатэлістаў нашай краіны і іх калег за рубяжом з лепшымі карцінамі заходнееўрапейскіх майстроў. Малы фармат знакаў паштовай аплаты не перашкаджае ўбачыць веліч палотнаў. Не могуць не выклікаць захаплення шматколерныя маркі з рэпрадукцыямі карцін вялікіх жывапісцаў свету — Рафаэля, Гагена, «Вяртанне блуднага сына» Рэмбранта, «Сямейны партрэт» Ван Дэйка, «Эцюд да партрэта актрысы Самары» Рэнуара, «Персей і Андрамеда» Рубенса, «Апосталы Пётр і Павел» Эль Грэка. Да гэтай серыі быў выдадзены паштовы блок, на марцы якога рэпрадуцыравана палатно «Мадонна Літа» вялікага Леанарда да Вінчы.

Маркі і блокі, выпушчаныя ў розныя гады, дазваляюць пазнаёміцца з вялікімі творамі прадстаўнікоў італьянскай і іспанскай школ, з карцінамі фламандскіх і нідэрландскіх майстроў. З фондаў Дзяржаўнага Эрмітажа на савецкіх марках шырока прадстаўлены французскі жывапіс. Гэта палотны Шардэна, Пусэна, Вато, Дэлакруа, Рэнуара, Манэ, Пікасо і інш. Серыяй марак і блокамі было адзначана 400-годдзе з дня нараджэння Рубенса, 500-годдзе з дня нараджэння Джарджоне, 450-годдзе з дня нараджэння Веранезе. Усе гэтыя серыі ўражваюць нават далёкага ад філатэліі чалавека.

Філатэлістычны расказ аб Эрмітажы дапаўняюць канверты з малюнкамі і спецыяльнымі штэмпелямі. На малюнках — будынак Эрмітажа, карціны, скульптуры. Савецкая пошта таксама выпусціла некалькі мастацкіх канвертаў з адлюстраваннямі скарбаў скіфскіх курганоў, шматлікая калекцыя якіх захоўваецца ў Эрмітажы. Варта да гэтага дадаць, што паштовае аддзяленне пры Эрмітажы вось ужо некалькі гадоў для гашэння карэспандэнцыі карыстаецца пастаянным мастацкім штэмпелем.

Карцінная галерэя Эрмітаж — у альбоме філатэліста. Хто застанецца раўнадушным перад такім зборам! Не дзіўна, што тэма «Жывапіс» заваёўвае ўсё больш прыхільнікаў сярод калекцыянераў.

Леў КОЛАСАЎ.

РЫХТУЕЦЦА ДА ВЫХАДУ

«Гістарычны слоўнік беларускай мовы» рыхтуецца да выдання на працягу многіх гадоў пад кіраўніцтвам члена-карэспандэнта АН БССР А. Жураўскага ў Інстытуце мовазнаўства імя Якуба Коласа. Вялікае значэнне слоўнік набудзе для гісторыкаў у іх рабоце над тэкстамі старажытнай пісьменнасці, для этнографаў, правазнаўцаў і іншых спецыялістаў, якія займаюцца вывучэннем мінулага свайго народа. Слоўнік з'явіцца важкім укладам у скарбніцу беларускай культуры наогул. Адлюстраванае ў ім слоўнікавае багацце будзе характарызаваць ступень развіцця народа, яго побыт, кола духоўных інтарэсаў.

Першыя спробы лексікаграфічнай апрацоўкі слоўнікавага складу старажытнай беларускай пісьменнасці адносяцца да XIX стагоддзя. Неабходнасць гістарычнага слоўніка ўсведамляў і заснавальнік беларускай філалогіі Я. Карскі. Выдатны вучоны ў сваіх нататках акрэсліў і вызначыў важнейшыя абрысы яго.

Больш чым дзесяць гадоў стваралася картатэка, якая налічвае цяпер звыш мільёна картак. Крыніцамі слоўніка паслужылі беларускія пісьмовыя помнікі XV—XVIII стагоддзяў.

Першыя тры выпускі «Гістарычнага слоўніка беларускай мовы» падрыхтаваны і здадзены ў выдавецтва, яшчэ тры рэдагуюцца. Усяго ж мяркуецца выдаць 30—35 выпускаў, якія будуць выходзіць у свет на працягу некалькіх бліжэйшых дзесяцігоддзяў. У завершаным выглядзе «Гістарычны слоўнік беларускай мовы» — гэта шматтомнае выданне, дзе ў алфавітным парадку будзе размешчана ўсё зафіксаванае ў помніках старажытнай пісьменнасці беларусаў лексічнае багацце нашай мовы. Кожнае слова суправаджаецца тлумачэннем або перакладам на сучасную беларускую мову, далей прыводзіцца дастатковая колькасць прыкладаў-сказаў, якія ілюструюць ужыванне яго ў помніках розных перыядаў і жанраў.

В. ЛЯПЁШКІН.

Спорт

НА КУБАК «КРОС НАЦЫЙ»

Гэта вестка прыйшла з Італіі. Жаночая каманда СССР заваявала ганаровы Кубак «Крос нацый», выйграўшы чэмпіянат свету па кросу. За каманду выступалі масквічка Алена Сіпатава, мінчанка Раіса Смяхнова, Таццяна Пазднякова з Улан-Удэ і Галіна Захарава з Чэлябінска. Гэта пятая перамога нашых жанчын на такіх спаборніцтвах.

Мужчынская зборная, за якую выступаў мінчанін Віктар Чумакоў, заняла трэцяе месца.

ТАКОГА ЯШЧЭ НЕ БЫЛО

Восем медалёў заваявалі каратысты Беларусі ў Таліне на першынстве краіны.

На верхнюю прыступку п'едастала гонару падняліся А. Міхайлаў, В. Грыневіч і А. Кур'яновіч. Сярэбраных узнагарод удастоены С. Круцікаў — за другія месцы ў вазе да 80 кілаграмаў і ў абсалютнай катэгорыі. «Бронза» ў В. Задзірана, А. Кажамякіна і Л. Лушчыка.

Ніколі яшчэ так удала не выступалі нашы каратысты.

ЧАЦВЁРА З ШАСЦІ

«Савецкім» аказаўся фінал міжнароднага турніра па фехтаванню «Залатая шабля», які прайшоў у заходнегерманскім горадзе Гановеры. Чатыры нашых спартсмены з шасці выйшлі ў фінал.

Першае месца заняў масквіч Віктар Кравапускаў. На другім і трэцім — адпаведна мінчанін Мікалай Алёхін і Хусейн Ісмаілаў з Масквы.

ЦЯПЕР — ПАЎФІНАЛ

Перамогшы з лікам 4:2 зборную Францыі, футбалісты Савецкага Саюза выйшлі ў паўфінал маладзёжнага чэмпіяната Еўропы.

За нашу каманду гулялі ігракі мінскага «Дынама» Ігар Гурыновіч (ён забіў чацвёрты мяч у вароты французаў) і былы выхаванец беларускага футбола Аляксандр Галаўня.

БАРАЦЬБА САМБА

У Барнауле на чэмпіянаце Савецкага Саюза па барацьбе самба мінчанін Міхаіл Рамазанаў заваяваў залаты медаль у вагавай катэгорыі да 82 кілаграмаў.

Яшчэ ў пяці вагавых катэгорыях вызначыліся барцы Беларусі. Сярэбраных узнагарод дамагліся мінчане В. Каракулька і А. Новік.

Гамяльчанін В. Крыванагаў хаця і не заваяваў медаля, але звярнуў на сябе ўвагу спецыялістаў. Пятае месца маладога спартсмена — таксама поспех.

Гумар

— Мяне хвалюе, доктар, што мая жонка гаворыць праз сон,— скардзіцца пацыент псіхіятру.

— А што яна кажа?

— Яна часта паўтарае: «Не, Шарль, не!»

— Чаму гэта вас хвалюе?

— Мяне ж завуць Жан!..

— Дык яна ж і гаворыць: «Не Шарль».

●

У Чыкага мужчыны сядзяць за столікам у кафэ. Адзін з іх з апетытам есць, а другі толькі зіркае ў бок вешалкі.

— Чаму вы не абедаеце? — пытае першы.

— Не магу. Пільную сваё паліто.

— Вось дзівак...

— Гэта вы дзівак. Некалькі хвілін назад ваша паліто ўкралі.

●

Малады чалавек паступіў на працу ў майстэрню, але праз месяц яго звольнілі. Бацька запытаў, як гэта здарылася.

— Ведаеш, шэф проста пазайздросціў мне. А ты ведаеш, які ён: рукі ў кішэні і праходжваецца, глядзіць, як іншыя працуюць

— Дык чаго ж ён табе зайздросціў?

— Усе ў майстэрні лічылі, што я шэф.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ

НАШ АДРАС:

МІНСК-ГСП, ЛЕНІНСКІ ПРАСПЕКТ, 44.
ТЭЛЕФОНЫ: 33-01-97, 33-02-80, 33-03-15, 33-16-56, 33-07-82.

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.
Зак. 650.